матэрыял нацыі перамолваўся ў насельніцтва. Тут асобу прыраўноўвалі да функцыі. У такіх гета нарадзіўся моўны кентаўр — трасянка.

Я ніколі ня бачыў ніводнага чалавека ў цьвярозым стане і тым больш нападпітку, які б сказаў пра сябе „*я — трактарабудаўнік*". У знакамітай піўной *трактарнага пасёлку* такі зварот да суседа мог бы скончыцца фатальна.

*Трактарабудаўнік* — кентаўр нашага стагодзьдзя, а кентаўраў, як вядома, няма.

# Трасянка

***Рыгор Барадулін***

Слова *трасянка* бярэ свой пачатак зь сялянскага побыту. Калі ўвобмаль было ласага, мурожнага ці поснага сена, яго страсалі з саломай, каб дацягнуць да травы, і елі *трасянку* і каровы, і коні.

Другое значэньне слова *трасянка* ўзьнікла ў выніку спачатку паланізацыі, а потым у асноўным як вынік павальнай русыфікацыі, асабліва за савецкім дыктатам.

З маленства помню — бабуля Маланьня кпіла з падшляхтункоў, з „пшэвруцэнцаў", як яна іх называла, якія казалі: „Едэн конь бялы, а другі вараной".

Пры камуністычным рэжыме верхнія слаі чынавенства былі завезеныя з Расеі, а сярэдні і ніжэйшы слаі русіфікаваліся саматужна. І шырылася *трасянка*.

Асабліва каларытная *трасянка* была ў чырвоных памешчыкаў. Дома іншы ў асноўным гаварыў больш-менш па-беларуску, а ўжо на нарадах — ад раёну і вышэй — стараўся „па-рюсскі". І тады перлі пэрлы кшталту „вобразна гавара", „нада апрадзяліцца". Слова, схопленае на ляту з вуснаў чарговага генэральнага сакратара, даводзілася да абсурду. „Образна гавара, мы праступілі да копкі бульбы". „Образна гавара, мы зжалі азімыя".

*Трасянка* была выведзеная і на ўзровень Вярхоўнага Савету. Яна пачала называцца *дземянцееўкай*..

Апошнім часам з вуснаў кіраўніка рэжыму прагучала адкрыцьцё, што ў Беларусі на ўрадавым узроўні — не *трасянка*, а новая расейская мова, яе беларускі варыянт. Тут ужо расейцам трэба сказаць усьлед за Тургеневым: „Как не впасть в отчаяние..."

*Трасянка* мае таварнае кляймо „Зроблена ў СССР. Рамонту не падлягае". У нармальнай цывілізаванай дзяржаве мова асноўнай нацыі — дзяржаўная. А ў нас, пакуль дзяржава будзе нагадваць нешта стрэсенае, *трасянка* будзе квітнець на прасьмех адукаваных народаў. Стрэс ад камуністычнай ідэалёгіі амаль невылечны, асабліва ў нашай беларускай рэчаіснасьці.

# Туалет

***Алена Ціхановіч***

„Гэны генэрал прыехаў са сваім клязэтам. Шпакоўня такая, у нас на двары стаяла. Ён сядзіць, а салдат ахоўвае", — такое было найбольшае ўражаньне ад сустрэчы зь немцамі-акупантамі адной беларускі, якая памятае вайну дзяўчынкай.

Іншая цётка, вярнуўшыся з-за мяжы, на пытаньне „што найбольш уразіла" адказала: „*Туалет*. Я б хацела там памерці, на той ружовай кафлі".